Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суды ў Магілёве і Бабруйску: на суткі адправілі сем чалавек дапоўнена

11.05.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў

У панядзелак, 11 траўня, пачынаюцца суды над затрыманымі на выходных і ў пятніцу актывістамі і журналістамі. Усіх затрымалі нібыта за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. Сярод тых, над кім чакаюцца суды ў Магілёве, — праваабаронца "Вясны" Аляксандр Буракоў, блогер Міхаіл Аршынскі, журналіст БелаПАН Алесь Асіпцоў, грамадскія актывісты Андрэй Бодзілеў і Станіслаў Паўлінковіч і іншыя. Суды над актывістамі чакаюцца і ў Бабруйску.



У суд прывезлі Алеся Буракова. Фота: Радыё Свабода

Вынікі магілёўскіх судоў над актывістамі і журналістамі 11 траўня:

- актывістка "Маці 328" **Інна Джумава** — 3 сутак;
- падпісчык "Краіны для жыцця" **Уладзімір Барэйша** — 8 сутак;
- **Стас Расінскі**, які "карміў галубоў" — 10 сутак;
- блогер і журналіст **Міхаіл Аршынскі** (заўтра яшчэ адзін суд) — 10 сутак;
- актывіст **Станіслаў Паўлінковіч** (асудзілі па трох артыкулах) — 15 сутак;
- **Барыс Огнеў** - 7 сутак;
- **Мікіта Ігнашын** - 10 сутак;
- сябра АГП **Таццяна Сівачэнка** — 25 базавых велічыняў (675 рублёў);
- праваабаронца і журналіст "Магілёўскай вясны" **Аляксандр Буракоў** — перапынак да 12 траўня 10:00;
- актывіст **Ігар Шчамялёў** — перапынак да 14 траўня 14:30;

Усе арыштаваныя будуць адбываць пакаранне ў Ізалятары часовага ўтрымання УУС Магілёўскага аблвыканкама,
вуліца Крупскай 99Б, г. Магілёў, 212011

Падрабязнасці з судоў — ніжэй.

У суд Ленінскага раёна г. Магілёва прывезлі праваабаронцу і журналіста "Вясны" **Аляксандра Буракова.** На яго складзены пратакол паводле артыкула 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве). Як распавёў Аляксандр Буракоў, у пратаколе супрацоўнікі міліцыі пазначылі толькі адзін радок, што ён ўдзельнічаў у акцыі каля ІЧУ. Хаця, як настойвае праваабаронца, удзел у акцыі ён не прымаў. Ён не згодны з абвіначваннямі. Адміністрацыйную справу праваабаронцы прызначаны разглядаць суддзя **Палякова**.

У суд даставілі таксама падпісчыка "Краіны для жыцця" **Уладзіміра Барэйшу**. Яго, як Аляксандра Буракова і **Станіслава Паўлінковіча**, затрымалі ў пятніцу. На ІЧУ іх прывезлі пасля адбою. Суд над Уладзімірам Барэйшам прызначаны на 14:40. Суддзя — **Урублеўская**.

Дапоўнена. Стала вядома, што суд над Аляксандрам Бураковым прызначаны **на 14:10**. Але ў 11:10 скончыўся максімальна магчымы 72-гадзінны тэрмін затрымання. Праваабаронца напісаў скаргу ў судзе. Затым праваабаронца накіраваўся ў пракуратуру для абскарджвання дзеянняў супрацоўнікаў міліцыі. Пракурор сказаў, калі старэйшы ўчастковы **Гоманаў** будзе працягваць утрымліваць праваабаронцу, то трэба пісаць скаргу менавіта на яго.

Як паведамляе mspring.online, у суд Кастрычніцкага раёна г. Магілёва дастаўлена **восем адміністрацыйных справаў** па артыкулу 23.34 КаАП. Час судоў пакуль невядомы. Паколькі ў 13 гадзін у судзе пачынае абед, працэсы адбудуцца пасля 14 гадзін.

Дапоўнена. Стала вядома, над кім у бліжэйшы час яшчэ адбудуцца суды:

- **Таццяна Сівачэнка і Мікіта Ігнашын** — пасля 14:00 у судзе Кастрычніцкага раёна. Суддзя **Зарычнюк.** Затрыманая знаходзілася ў ІЧУ;
- **Іна Джумава** — пасля 14:00 у судзе Кастрычніцкага раёна. Суддзя **Селядцова**. Затрыманая знаходзілася ў ІЧУ;

Па дадзеных праваабаронцаў, у ІЧУ чакаюць судоў **Міхаіл Аршынскі, Барыс Огнеў, Станіслаў Паўлінковіч, Ігар Шчамялёў, Андрэй Бодзілеў, Алесь Асіпцоў**. Нагадаем, 8 траўня суд Ленінскага раёна Магілёва адправіў на "суткі" пяць чалавек, якіх затрымалі яшчэ 6 траўня. Гэта каманда "Краіна для жыцця" з аўтадома і жыхары Магілёва, якія адбівалі кіроўцу аўтадома ад міліцыі: блогер **Уладзімір Няронскі** (10 сутак), **Арцём Сакаў** (5 сутак), **Аляксандр Арановіч** (6 сутак), **Сцяпан Лазаронак** (5 сутак), **Вячаслаў Зайцаў** (2 сутак).

Дапоўнена. Як паведамляе mspring.online у суд Кастрычніцкага раёна Магілёва даставілі блогера і журналіста Міхаіла Аршынскага. Яго працэс пачнецца ў 14:10, суддзя — **Міхайлава**. Яна прызнала блогера вінаватым па артыкуле 23.34 КаАП і асудзіла яго **на 10 сутак арышту**. Праваабаронцы "Магілёўскай вясны" адзначаюць, што 12 траўня ў яго ў судзе Ленінскага раёна прызначанае яшчэ адно судовае пасяджэнне.



Праваабаронца і журналіст Аляксандр Буракоў перад пачаткам суда. Фота: MSPRING.ONLINE

У судовым працэсе па справе праваабаронцы і журналіста "Магілескай вясны" Аляксандра Буракова абвешчаны перапынак да 15:00. Ён пахадайнічаў аб прадастаўленні яму часу на пошук і заключэнне дамовы з адвакатам. Суддзя адразу спытала, ці не мог ён знайсці яго пасля затрымання, хаця сам праваабаронца да 11:00 сённяшняга дня знаходзіўся ў ІЧУ. У выніку Палякова дала 40 хвілін на пошукі адваката. Пасля перапынку сакратарка суддзі прывяла Аляксандру Буракова абаронцу. Верагодна, дзяржаўнага. Праваабаронца мае намер адмовіцца ад яго і чакаць свайго адваката, які згодны заключыць з ім дамову.

Магілёўскія праваабаронцы паведамляюць, што Аляксандру Буракову ставяць у віну **дзве хвіліны ўдзелу** ў "несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве". Доказам выступілі скрыншоты з стрыму блогера Міхаіла Аршынскага, у якога сёння таксама чакаецца суд. Пры гэтым Буракоў не ўдзельнічаў у масавай акцыі — ён прывёз да ІЧУ двух прыхільнікаў блогера Сяргея Ціханоўскага (Сяргея Лазарэнку і Андрэя Ільюка), якіх міліцыя затрымала разам з Ціханоўскім.

Пастанова суда па адміністрацыйнай справе Аляксандра Буракова будзе агучана заўтра,**12 мая, у 10 гадзін раніцы**. Яго адпусцілі на волю. З пятніцы ён знаходзіўся ў ІЧУ.

У 15:00 пачынаецца суд над сябрам АГП **Таццянай Сівачэнка**. Суддзя — **Вольга Зарычнюк**. Ёй прысудзілі штраф **25 базавых велічыняў (675 рублёў)**.

Як паведамляе mspring.online, суддзя Урублеўская паведаміла Уладзіміру Барэйшу, што ён можа скарыстацца паслугамі дзяжурнага адваката, але Барэйша адмовіўся. Працэс працягнуўся без абаронцы. Уладзімір прызнаў, што прыехаў 6 траўня да ІЧУ УУС Магілёўскага аблвыканкама, каб падтрымаць і выказаць салідарнасць з блогерам **Сяргеем Ціханоўскім**. Ён заявіў, што не лічыць гэта правапарушэннем. На пытанне суддзі, ці прызнае ён, што быў там і ці прызнае ён гэта і сваю віну, Барэйша адказаў сцвярджальна. У выніку суддзя вынесла рашэнне — прызнаць Уладзіміра Барэйшу вінаватым і пакараць яго **8 суткамі арышту**.

Актывістку "Маці 328" Інну Джумаву суд пакараў таксама **3 суткамі арышту**. Як паведамляе "Радыё Свабода", гэты тэрмін у яе заканчваецца сёння а 18:30. Актывісткі ініцыятывы, якія прыехалі яе падтрымаць, будуць чакаць яе выхаду на волю каля суду.

Дапоўнена. Паводле інфармацыі магілёўскіх праваабаронцаў, журналіста **Алеся Асіпцова** і каардынатара ініцыятывы "За здаровы Магілёў" **Андрэя Бодзілева** будуць судзіць у аўторак 12 траўня ў судзе Кастрычніцкага раёна.

Паведамляецца, што сёння адбудзецца суд **Ігарам Шчамялёвым** у 17:00 у судзе Кастрычніцкага раёна. Суддзя — **Пушкіна**. Праваабаронцы адзначаюць, што Шчамялева затрымалі ў ІЧУ больш чым на 72 гадзіны, што з'яўляецца парушэннем закона. Паведамляецца, што абвешчаны перапынак у судовым працэсе Ігара Шчамялёва да **14 траўня 14:30**. У суд не з'явіліся двое сведак — супрацоўнікаў міліцыі.

Таксама ў суд Ленінскага раёна даставілі актывіста **Станіслава Паўлінковіча**. Яго затрымалі 8 траўня проста на працоўным месцы на Магілёўскім металургічным заводзе. Суд па Паўлінковічу пачаўся а 16:00. Суддзя — **Ланчава**. Акрамя ўдзелу ў несанкцыянаванай акцыі пратэсту, Паўлінковічу ставяць у віну супраціў законным патрабаванням супрацоўніка міліцыі (23.4 КаАП) і абразу службовай асобы (23.5 КаАП). Станіслава Паўлінковіча па трох артыкулах адміністрацыйнага арышту асудзілі **на 15 сутак**.

Як паведамляе mspring.online, **Стаса Расінскага**, які нібыта "карміў галубоў", асудзілі на **10 сутак арышту** па артыкуле 23.34 КаАП. За сустрэчу з блогерам Ціханоўскім асудзілі **на 7 сутак** таксама Барыса Огнева і Мікіту Ігнашына на **10 сутак арышту**.

Сітуацыю ў судзе Ленінскага раёна г. Магілёва маніторацъ праваабаронцы "Вясны" **Барыс Бухель** і **Аляксей Колчын**. На суды ў Магілёў прыехала шмат палітыкаў: **Анатоль Лябедзька, Ігар Барысаў, Мікалай Казлоў**, прыйшлі жанчыны з руху "Маці 328", прысутнічае шмат журналістаў.

БАБРУЙСК

У Бабруйску сёння чакаецца суд над блогерам **Дзмітрыем Цімафеевам** (Баранавічы), якога затрымалі 9 траўня. Акрамя гэтага, як паведамляе праваабаронца "Вясны" **Сяржук Лацінскі**, таксама ў Бабруйску павінны судзіць паводле артыкула 23.34 КаАП **Юрыя Салаўёва** (Ворша) і **Андрэя Шуляка** (Мінск). Пад судом Бабруйскага раёна і г. Бабруйска стаіць аўтазак.

Дапоўнена. А 15 гадзіны з яго вывелі **шэсць чалавек**. Акрамя названых, за ўдзел у акцыі затрымалі **Аляксандра Ярмоленку** (Жлобін) і **Дзмітрыя Вальфсона**, якога затрымалі ў Бабруйску, калі той выехаў са свайго двара ў працоўнай вопратцы. Таксама паведамляецца пра **Сяргея Аднамаха** з вёскі Бабірова Глускага раёна, якога затрымалі на прыпынку вуліцы Інтэрнацыянальнай у Бабруйску. Ён проста прыехаў у горад на базар, ні ў чым не ўдзельнічаў.

У 16:30 праваабаронца "Вясны" Сяргей Лацінскі паведаміў, што шасцярых затрыманых зноў адправілі ў ізалятар. Суды над імі чакаюцца заўтра, але час іх невядомы.



Поўны спіс затрыманых прыхільнікаў блогера Ціханоўскага і іншых актывістаў

Восьмага траўня ў Беларусі працягваюцца затрыманні і выклікі ў міліцыю прыхільнікаў затрыманага блогера Сяргея Ціханоўскага, а таксама тых, хто пачаў выходзіць па нядзелях на галоўныя плошчы сваіх гарадоў і карміць галубоў у знак салідарнасці з экалагічнымі актывістамі Брэста. Затрыманні не спыніліся і 9 траўня - людзей забіраюць з дамоў ці спыняюць па дарозе ў Бабруйск, дзе запланавана правядзенне "Антыпараду".

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку" Павел

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

